УДК 82–1:821.161.3

Т. А. Матрэнка, аспірант
(БДПУ, г. Мінск)

# ФАРМАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ І РЭЦЭПТЫЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ МЕДЫЯПАЭЗІІ

У пошуках новых сродкаў выразнасці паэты XXI ст. усё часцей звяртаюцца да магчымасцей камп'ютарных праграм і мультымедыйных сродкаў, а вызначэнне паэзіі як мастацтва слова сёння ўжо не вычэрпвае сутнасці паняцця. Творчае асэнсаванне аўтарамі набыткаў эры інфармацыйных тэхналогій прыводзіць да трансфармацыі паэтычнага тэксту, фарміравання новых спосабаў яго распаўсюджвання і прэзентацыі, якія ў сваю чаргу ўплываюць на рэцэпцыю твора.

Уплыў экстралітаратурных фактараў на фармальна-зместавае аблічча нацыянальнай паэзіі стаў сапраўды адчувальным у пачатку 2000-х гг. дзякуючы шырокаму распаўсюджанню інтэрнэту. Да гэтага часу адносіцца ўзнікненне шэрагу літаратурных прэцэдэнтаў у віртуальнай прасторы, якія дазваляюць гаварыць пра існаванне ў беларускім сегменце інтэрнэту такой з'явы, як «*сеціратура*». Дадзеным тэрмінам у шырокім сэнсе вызначаюць увесь корпус тэкстаў мастацкай літаратуры, змешчаны ў сеціве. У вузкім сэнсе пад сеціратурай падразумяваюць творы, што ўзніклі ў інтэрнэце дзякуючы яго спецыфічным магчымасцям [3]. Іх выкарыстанне абумоўлівае жанрава-стылявыя адметнасці падобнай літаратуры, якія страчваюцца пры транспанаванні твора ў папяровы варыянт.

Яскравы прыклад эксперыментальнага выкарыстання рэсурсаў інфармацыйных тэхналогій у мэтах вырашэння мастацкай задачы ўяўляе нізка вершаў «*Spes Phtisica*» **Алеся Плоткі** [1]. Паводле формы гэта аўдыёзапісы вершаў у якасці *Lo-Fi*, аб'яднаныя з дапамогай праграмнага інструменту *Knightlab*, які дазваляе візуалізаваць храналогію падзей.

На сённяшні дзень нізка «*Spes Phtisica*» існуе толькі ў віртуальным варыянце і даступная аўдыторыі ў інтэрнэт-прасторы, таму па сутнасці з'яўляецца прыкладам сеціратуры ў шырокім сэнсе. Аднак такое вызначэнне занадта агульнае, паколькі яму адпавядае шэраг аўтарскіх паэтычных тэкстаў, размешчаных у адкрытым доступе ў інтэрнэце, і не ўлічвае спецыфікі формы твораў. Пры транспанаванні ў кніжны варыянт вершы з нізкі

«*Spes Phtisica*» адразу губляюць арыгінальнасць формы, бо сутнасць эксперыменту ўтрымліваецца менавіта ў гукавой форме выяўлення паэтычнай думкі, а інтэрнэт выконвае ролю выключна сродку сувязі паміж творцам і аўдыторыяй.

У выпадку з нізкай А. Плоткі выключнае значэнне мае якасць гукавога запісу. Сёння фармат *Lo-Fi* выкарыстоўваецца ў мастацкіх мэтах у розных музычных стылях. Рэцэпцыя вершаў, начытаных у такой якасці, адрозніваецца іх ад запісаных у прафесійных студыях гуказапісу або выдадзеных у кнігах. Ствараецца ўражанне, што ад нараджэння твора да яго фіксацыі праходзіць невялікі прамежак часу, таму стадыі рэдагавання выключаюцца, у выніку аўтарская задума транслюецца ў першасным, некранутым стане, а фонавы шум малюе карціну творчага працэсу ў «палявых» умовах.

Відавочна, мы маем справу з трансфармацыяй паэтычнага тэксту, абумоўленай гукавой формай існавання, што набліжае вершы з нізкі «*Spes Phtisica*» да саўндпаэзіі як разнавіднасці медыяпаэзіі. Аднак унутраная структура такіх твораў звычайна адрозніваецца багаццем фонавых гукаў розных тэмпаў і танальнасцей, наяўнасцю хуткіх зменаў і пераходаў, паўз у маўленні, фанетычных акцэнтаў, музычных фрагментаў, тады як саўндінструментарый А. Плоткі нельга назваць такім разнастайным.

Акрамя таго, «*Spes Phtisica*» валодае ўласцівасцямі, якія родняць яе з жанрам электроннай, або лічбавай паэзіі,– яшчэ адзін прадукт уплыву інфармацыйных тэхналогій на сучасную літаратуру. Літаратуразнаўчы дыскурс прапануе некалькі вызначэнняў дадзенага паняцця. Паводле найбольш агульнага з іх, «электронная паэзія – гэта лічбавае па паходжанні літаратурнае мастацтва, што выкарыстоўвае трансмедыйныя магчымасці лічбавага асяроддзя» [4]. Інакш кажучы, верш з'яўляецца лічбавым, калі праграмаванне або праграмныя сродкі выкарыстоўваліся падчас стварэння і прэзентацыі тэксту (камбінацыі тэкстаў). А. Плотка аб'яднаў вершы ў нізку з дапамогай праграмы *Knightlab*, якая дазваляе візуалізаваць храналогію падзей, у нашым выпадку – творчага працэсу. З аднаго боку, такім чынам паэт прэзентуе і распаўсюджвае паэзію, а значыць, «*Spes Phtisica*» – яскравы прыклад сеткавай паэзіі з другога – магчымасці камп'ютарнай праграмы разам са спавядальнымі інтанацыямі, непрычасанасцю стылю, выкарыстаннем размоўнай лексікі дазваляюць стварыць атмасферу дзённікавасці. Напісанне паэтычнага тэксту сродкамі

праграмавання – адна з вызначальных характарыстык лічбавай паэзіі, і хоць вершы А. Плоткі створаны традыцыйным спосабам, тым не менш форма іх існавання відавочна паўплывала на характар рэцэпцыі: нізка «*Spes Phtisica*» ўспрымаецца як дзённік, што зафіксаваў асаблівы перыяд у жыцці творцы.

У шэрагах тых, хто актыўна выкарыстоўвае магчымасці мультымедыйнага асяроддзя для рэалізацыі мастацкай ідэі, трывалую прапіску атрымаў паэт і перакладчык **Віталь Рыжкоў**, аўтар зборніка «Дзверы, замкнёныя на ключы» (2010) [2]. Некаторыя вершы з кнігі існуюць у відэафармаце і па сутнасці з'яўляюцца сінкрэтычнымі літаратурна-мультымедыйнымі кампазіцыямі.

Характэрным прыкладам можам назваць відэаролік «Дарожныя здарэнні», дзе назіраецца цеснае ўзаемадзеянне аўдыёвізуальнага і вербальнага складнікаў. У аснове верша – аповед пра выпадак на дарозе: аўтамабіль сутыкнуўся з ласём. Аўтарскае чытанне верша суправаджаецца музычным фонам, які задае адпаведны зместу твора настрой. Слоўныя вобразы падмацоўваюцца ўрыўкамі кароткаметражнага анімацыйнага фільма Л. Шмялькова «Мой асабісты лось». Зразумела, што вобраз жывёльнага свету ў вершы «Дарожнае здарэнне» выконвае сімвалічную ролю і прадугледжвае розныя варыянты інтэрпрэтацыі. Прычым, калі твор успрымаецца традыцыйным для паэзіі спосабам, то чытач застаецца сам-насам з пытаннем, чым з'яўляецца лось для лірычнага героя. У відэавершы слоўныя вобразы візуалізуюцца літаральным чынам, што ўносіць змены ў сцэнар успрымання твора: адзін з варыянтаў інтэрпрэтацыі становіцца больш выразным, тым больш яго прапануе сам паэт, што ў многім забяспечвае поспех камунікацыі з чытачом.

Слова, музыка і анімацыя ў непадзельным адзінстве вызначаюць мастацкую сутнасць сінкрэтычнай кампазіцыі В. Рыжкова. Як характэрны прыклад медыяпаэзіі «Дарожнае здарэнне» дэманструе прадуктыўнае ўзаемадзеянне твораў розных аўтараў і розных відаў мастацтва.

Заўважым, што аўдыёвізуальныя практыкі нельга назваць устойлівым кірункам у сучаснай беларускай літаратуры, гэта перш за ўсё эксперыменты, асобныя праекты маладых аўтараў, у многім разлічаныя на фарміраванне ўласнага медыявобраза, пашырэнне кола патэнцыяльных чытачоў за кошт тых карыстальнікаў сеціва, якія не з'яўляюцца прыхільнікамі традыцыйнай «друкаванай» паэзіі.

**Літаратура**

1. Плотка, А. «Spes Phtisica» [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://soundcloud.com/baisan88/sets/baisan-spes-phtisica.– Дата доступу: 02.05.2019.
2. Рыжкоў, В. Дзверы, замкнёныя на ключы.– Мінск: І. П. Логвінаў, 2010.– 108 с.
3. Схелтйенс, В. Сетература: новое литературное движение? [Электронны рэсурс] // Сетевая словесность.– Режим доступа: https://www.netslova.ru/teoriya/werner.html.– Дата доступа: 10.03.2019.
4. What is E-Lit? [Electronic resource] // Electronic Literature Organization.– Mode of access: http://eliterature.org/what-is-e-lit/.– Date of access: 02.05.2019.

УДК 821.161.3.09 (092)

І. С. Мяцеліца, мнс аддзела
беларускай літаратуры ХХ і ХІХ стст.
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

## МАЛАЯ РАДЗІМА: ВОБРАЗ МІНСКА Ў КНІЗЕ АНТОНА РУДАКА «ВЕРХНІ ГОРАД»

Адлюстраванне ў беларускай паэзіі вобраза малой радзімы часта натуральна перасякаецца з магістральнай для айчыннай літаратуры вясковай тэматыкай. Да апошняй трэці ХХ стагоддзя большасць аўтараў, чыё творчае сталенне і раскрыццё пісьменніцкага таленту прайшло ў гарадскім асяроддзі, мела вясковае паходжанне. Пры ўсёй разнастайнасці тэматычнага дыяпазону ў творчасці кожнага з іх ёсць месца вершам, прысвечаным асобным рэгіёнам, вёскам, мястэчкам Беларусі, з якімі звязаны ўспаміны дзяцінства і юнацтва. Сучасныя паэты з падобнай біяграфіяй і сёння поўняць скарбонку вясковай лірыкі, апісваючы ў вершаваных радках дарагія сэрцу мясціны. Аднак побач з імі на літаратурнай ніве расце новае пакаленне пісьменнікаў, для каго малой радзімай з’яўляюцца вялікія гарады. Адзін з іх – перспектыўны малады аўтар Антон Рудак, для якога родны Мінск стаў крыніцай натхнення для напісання дэбютнага зборніка паэзіі «Верхні горад».

Нават калі не браць ва ўлік месца нараджэння аўтара і назву зборніка, яго змест беспамылкова ўказвае на тое, што менавіта Мінск (за рэдкім выключэннем), а не іншы населены пункт стаў галоўным героем дадзенай кнігі (вершы «Чароўная песня Нямігі», «Могілкі Менска», «Аэрадромная», «Травень. Чэрвенка»,